# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 29 (816) | Серада, 6 лістапада 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


## НЕ ПРЫЙШЛІ ДА ЯСНАЙ ЯВЫ

Заўтра — 7 лістапада. Гэты, як і наступны дзень, у календары пазначаны чырвоным колерам. Гэта — святочныя дні. Яны ўстаноўлены ў азнаменаванне перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Пад яе сцягамі савецкія людзі пражылі ўжо 74 гады. З яе ідэямі імкнуліся да светлай камуністычнай явы. На шляху да самай запаветнай мары шмат нацярпеліся, панеслі мноства ахвяр. І ўрэшце рэшт зайшлі, як часта цяпер кажуць, у тупік. Па сутнасці не засталося непарушнага Саюза, зышла з палітычнай арэны і КПСС, з дзейнасцю якой былі звязаны ўсе нашы спадзяванні. Наша буйнейшая ў свеце краіна з самымі багатымі прыроднымі рэсурсамі аказалася ў выключна цяжкім эканамічным становішчы. Дзесяткі мільёнаў людзей апынуліся за рысай беднасці і галечы, усе больш праяўляюцца сацыяльныя заганы, расце беспрацоўе, абвастраюцца міжнацыянальныя адносіны. Карацей кажучы, мы з'яўляемся сведкамі такой сітуацыі, якой не пазайздросціць, а толькі паспачуваць.

Сёлетняе Кастрычніцкае свята пройдзе без былой пампезнасці, узбадзёрваючых заклікаў і лозунгаў. Ад іх сытныя не будзем. Асабліва цяпер, пры пустых у магазінах прылаўках і нястрымным росце цэн.

І ўсё ж свята (можа, у гэтыя дні яно акажацца і апошнім) ёсць свята. І мы віншуем з ім увесь універсітэцкі калектыў. Віншуем і спадзяемся, што з цягам часу пры агульным стараннi наша доля стане значна лепшай.

## ПРЫНЯТЫ ЗАКОН АБ АДУКАЦЫІ

29 кастрычніка на сесіі Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі прыняты Закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Камісія, якую ўзначальваў шырока вядомы беларускі паэт Ніл Гілевіч, і выступіўшыя ў спрэчках дэпутаты, як адзначаецца ў рэспубліканскай прэсе, шмат папрацавалі над тым, каб некалькі пазней спецыялісты прыйшлі да вываду: Закон аб адукацыі — адзін з лепшых, прынятых цяперашнім скліканнем Вярхоўнага Савета. У ім прадугледжана дакладная канцэпцыя перабудовы старой сістэмы, выхад на агульнаеўрапейскі адукацыйны ўзровень. У новай структуры немалая роля адводзіцца двухузроўневай вышэйшай адукацыі, дзейнасці гімназій, ліцэяў, коледжаў і г. д. Прычым, закон сур'ёзна не закранае нашы бюджэтныя рэсурсы сёння. Асноўныя з яго артыкулаў, якія патрабуюць дадатковага фінансавання, аднесены да 1994 года. А да гэтага часу рэспубліка, будзем верыць, выйдзе з эканамічнага крызісу.

Трое студэнтаў нашага універсітэта ўдастоены стыпендыі Вучонага савета ГДУ. Сярод іх — Ірына Бараш. Яна набывае спецыяльнасць эканаміста па працы і вучыцца ўжо на трэцім курсе ў групе ЭСП-33. Спытайце ў любога яе аднакурсніка і ніхто не скажа пра яе дрэннага слова. А, у прыватнасці, Ірына Гаманкова ў размове адзначыла:

— З Ірынай Бараш я вучуся з першага курса і пераканана, што яна заслугоўвае толькі добрых слоў.

Сапраўды, нават паглядзеўшы на гэты фотаздымак, па жыццярадаснай усмешцы, ясным позірку вачэй можна зрабіць вывад: гэта — шчырая, душэўная дзяўчына.

Да вучобы Ірына адносіцца з належнай сур'ёзнасцю, не прапускае заняткаў, трывала засвойвае ўсе дысцыпліны праграмных курсаў. Таму ў яе залікоўцы толькі выдатныя і добрыя адзнакі.

Аднак не трэба думаць, што шлях Ірыны ў ВНУ быў услany ружамі. У першы год паступлення атрымалася «асечка». Давялося год прапрацаваць у родным Светлагорску ў вытворчым аб'яднанні «Хімвалакно», з якім звязана працоўная дзейнасць яе бацькоў. Адсюль яна і атрымала накіраванне для паступлення на эканамічны факультэт ГДУ, стала стыпендыяткай прадпрыемства.



НА ЗДЫМКУ: стыпендыятка Вучонага савета Ірына Бараш. Фота У. Чысціка.

## БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА — 70 ГАДОЎ

30 кастрычніка споўнілася 70 гадоў з дня адкрыцця вядучай вышэйшай навучальнай установы нашай рэспублікі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У гэты дзень у Мінску прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя знамянальнай падзеі. У адрас юбіляра паступіла шмат віншаванняў. Ад калектыву нашага універсітэта за подпісам яго рэктара члена-карэспандэнта Беларускай Акадэміі навук, прафесара Л. А. Шамяткова на імя рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна члена-карэспандэнта Беларускай Акадэміі навук, прафесара Ф. Н. Капуцкага накіравана віншавальная тэлеграма наступнага зместу:

**«Дарагія сябры!**

**Сардэчна віншуем Вас са славутым юбілеем — 70-годдзем заснавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта. За гады існавання Ваш універсітэт стаў вядучай вучэбнай і навуковай установай Рэспублікі Беларусь. Тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў-выпускнікоў універсітэта самаадданна працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Шырока вядомы ў краіне і за мяжой навуковыя дасягненні вучоных універсітэта. Жадаем Вам, дарагія калегі, моцнага здароўя, новых поспехаў у навуковай дзейнасці і падрыхтоўцы кадраў высокай кваліфікацыі».**

## АБ ВЫХАДНЫХ ДНЯХ

**Рэктарат даводзіць да ведама студэнтаў і выкладчыкаў, што выхадныя дні ва універсітэце — 7, 8, 9 і 10 лістапада. Заняткі — з наступнага панядзелка.**

## ВЯРНУЛІСЯ З КІТАЯ

**На мінулым тыдні з Кітайскай Народнай Рэспублікі вярнулася дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе яго рэктара члена-карэспандэнта Беларускай Акадэміі навук прафесара Л. А. Шамяткова, першага прарэктара М. В. Селькіна, прарэктара па завочнаму навучанню М. М. Воінава, дэканаў матэматычнага і фізічнага факультэтаў У. В. Арлова і І. В. Семчанкі. Амаль за два тыдні знаходжання ў Пекіне ў іх адбылося шмат запамінальных сустрэч і экскурсій. Сваімі ўражаннямі аб паездцы ў краіну з багатай гістарычнай спадчынай і развітай сістэмай вышэйшай школы і навукі яе ўдзельнікі падзеляцца з чытачамі нашай газеты ў яе бліжэйшых нумарах.**

## *Прафком студэнтаў інфармуе*

### ДЛЯ ВЫЯЎЛЕННЯ ТАЛЕНТАЎ

На чарговым пасяджэнні прэзідыума прафсаюзнага камітэта студэнтаў прынята рашэнне аб выдзяленні 1600 рублёў на арэнду залы Палаца культуры «Гомельпрамбуда» для правядзення факультэцкіх конкурсаў «Ану, першакурснікі!» Акрамя гэтага кожнаму факультэту на правядзенне конкурсу выдзелена па 80 руб.

### НА МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

У наш складаны эканамічны час многія студэнты маюць патрэбу ў фінансавай падтрымцы. Для гэтых мэт выдзелена: філалагічнаму факультэту — 20 тысяч 500 руб., эканамічнаму — 17500, фізічнаму — 15300, матэматычнаму — 11600, біялагічнаму — 8700, геалагічнаму — 8600, факультэту фізічнай культуры — 8300, гістарычнаму — 7200. Па пытаннях аказання матэрыяльнай дапамогі неабходна звяртацца да прафоргаў груп і старшынь прафбюро факультэтаў.

### ПУЦЁЎКІ Ў САНАТОРЫЙ-ПРАФІЛАКТОРЫЙ

Наступны заезд у санаторый-прафілакторый ГДУ з 14 лістапада тэрмінам на 24 дні. Пуцёўкі размеркаваны па факультэтах: філалагічнаму і эканамічнаму — па 13 шт., фізічнаму — 11, матэматычнаму — 10, факультэту фізічнай культуры — 7, біялагічнаму і геалагічнаму — па 6 шт., гістарычнаму — 5.

### НА ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ

Студэнты, якія жадаюць адпачыць і паправіць сваё здароўе ў час зімовых канікулаў, могуць звяртацца па гэтых пытаннях з заявамі ў свой прафком.

